пераважна прыпісваецца сацыяльным антыподам селяніна – панам, які звычайна асацыююца з нячыстай сілай. Героі шматлікіх казак і паданняў змагаюцца з сацыяльным і духоўным прыгнётам, што сведчыць пра такую істотную каштоўнасць як воля, гэта значыць свабодна жыць на сваёй зямлі, кіраваць сваім лёсам і прымаць уласныя рашэнні. У беларускім фальклоры можна прасачыць прысутнасць прадстаўнікоў розных этнічных груп – цыганоў, габрэяў, украінцаў, палякаў і іншых. Нягледзячы на тое, што ў традыцыйнай культуры не заўсёды станоўча ўспрымаюцца «чужынцы» – ў беларускім фальклоры ўсе падобныя персанажы маюць і станоўчы бок: яўрэі заўсёды былі персанажамі беларускага вяселля, калядавання і батлейкі, цыганы набылі прызнанне як кавалі, музыкі, спевакі, танцоры і муштроўшыкі жывёл. Шматэтнічны і шматрэлігійны склад насельніцтва беларускіх земляў заклаў аснову такой каштоўнасці як талерантнасць.

Такім чынам, традыцыйная культура і нематэрыяльная спадчына выконваюць істотную ролю пры пабудове нацыянальнага праекту. Праз вывучэнне аўтэнтычнага фальклору адбываецца працэс асэнсавання норм, каштоўнасцяў, ідэалаў і маральна-этычных установак народу, які ў якасці сістэмы ўяўляюць сабой так званы "нацыянальны этас". Даследаванне этасу вядзе да больш грунтоўнага ўсведамлення духоўных арыенціраў нашага грамадства, яго каштоўнасцяў, ўзмацненню нацыянальнай ідэнтычнасці і разумення сваёй гістарычнай ролі.


1. Антропология А. Крёбера // УДІК [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://udik.com.ua/books/book-510/chapter-17693/. – Дата доступа: 10.04.2015.

2. Міфалогія беларусаў : энцыклапедычны слоўнік / І. Клімковіч [і інш.]; пад агул. ред. Т. Валодзіна. – Минск: Беларусь, 2011. – 605 с.

3. Салтыкова, О.В. Национальный этос и ценности трудовой деятельности / О.В. Салтыкова // электронная библиотека диссертаций [Электронный ресурс].– 2015. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/natsionalnyi-etos-i-tsennosti-trudovoi-deyatelnosti. – Дата доступа: 10.04.2015.

4. Хрох, М. От национальных движений к полностью сформировавшейся нации: процесс строительства наций в европе / М. Хрох. – М.: Пракис, 2001. – 436 с.


## ПЫТАННІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ФАЛЬКЛОРУ Ў ДЗЕЙНАСЦІ МАСТАЦКІХ АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАЎ ФАЛЬКЛОРНАГА КІРУНКУ


**Ражкова Л. Л.**

*кандыдат мастацтвазнаўства, заг. кафедры беларускай народна-песеннай творчасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*


Сучасны мастацкі калектыў фальклорнага кірунку – гэта адна з цікаўных і складаных форм мастацкага аматарства. Ён узнаўляе традыцыйную народную спадчыну (песні, танцы, інструментальныя найгрышы) пераважна ў сцэнічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

умовах. Будучы ізаляваным ад свайго прыроднага існавання фальклор на сцэне ператвараецца ў акт творчасці і адпаведна гэтаму ўспрымаецца.

У навуковай літаратуры даволі поўна адлюстравана праблема педагагічных магчымасцей аматарскіх мастацкіх калектываў. Значны ўклад ураспрацоўку гэтага пытання ўнеслі даследчыкі: Т.І. Бакланава, А.С. Каргін, Н.В. Кротава, Ю.Я. Сакалоўскі, Ф.А. Саламонік, Я.І. Смірнова, Ю.А. Стральцова. Пытанне педагагічнага патэнцыялу аматарства менавіта фальклорнага кірунку распрацавана значна менш (А.М. Аляхновіч, Н.К. Мешко, Б.М. Пуцілаў, У.І. Сітнікаў, Ю.М. Чурко, Л.В. Шаміна і іншыя). На нашу думку, такое становішча дэтэрмінавана перш за ўсё рознагалоссем у вырашэнні праблемы педагагічнага патэнцыялу фальклору ўвогуле.

Але і сёння даследчыкі не надаюць належнай увагі спецыфічным формам існавання фальклорнай творчасці, праекцыруюць педагагічны патэнцыял фальклору, у звыклым для іх сэнсе, на педагагічны патэнцыял фальклорнага аматарства і тым самым, свядома ці несвядома атаясамляюць гэтыя розныя паняцці, зводзяць іх адзін да аднаго. На наш погляд, такі шлях вядзе да памылак. Педагагічны патэнцыял фальклору і педагагічны патэнцыял аматарства фальклорнага кірунку не тоесныя паняцці. Іх агульныя рысы абумоўлены падабенствам мастацка-творчай дзейнасці ў фальклоры і аматарстве фальклорнага кірунку. Разам з тым, яны (педагагічныя патэнцыялы) не могуць быць зведзены адзін да другога ў выніку рознай прыроды гэтых з'яў. Арганізаванае мастацкае аматарства фальклорнага кірунку належыць узроўню фалькларызму, а не фальклору. У межах гэтай з'явы трацяцца ўсе асноватворныя характарыстыкі фальклору: унутрысітуацыйнасць, традыцыйнасць, вуснасць, калектыўнасць, сінкрэтызм.

Мастацка-педагагічны працэс у ансамблях, скіраваных на фальклор, працякае па-рознаму, таму можна сказаць, што і педагагічны патэнцыял фальклору рэалізуецца неаднолькава. Таму, для плённага этнакультурнага выхавання падрастаючага пакалення патрабуецца аналіз мастацка-педагагічных працэсаў калектыву “сцэнічнага” тыпу і калектыву “бытавога” тыпу. Параўнаць іх можна па некалькіх параметрах: па рэжыму ажыццяўлення гэтай дзейнасці, па рэгламентацыі ўзаемаадносін кіраўніка і ўдзельнікаў, па спосабе кіравання вучэбным працэсам з боку кіраўніка, па рэпертуарнай палітыцы, па выканальніцкай і сацыякультурнай дзейнасці. За аснову былі ўзятыя дадзеныя У.І. Сітнікава [0, с.95-97].

1. Навучанне ў аматарскіх фальклорных калектывах “сцэнічнага” тыпу (фальклорна-сцэнічных і народна-акадэмічных) выступае як асобны спецыялізаваны і самастойны этап іх мастацка-творчай дзейнасці. Ён мае рэгулярны характар і выступае як сістэма арганізаваных заняткаў (рэпетыцый) у адпаведнасці з дакладным раскладам. Тэматыка вучэбных заняткаў залежыць ад канкрэтных задач, якія ставіць перад сабой і калектывам кіраўнік; канцэртных праграм, якія рыхтуе калектыў. Таму асноўнае намаганне калектыву і кіраўніка (па даных нашага апытання кіраўнікоў) скіравана на ўдасканаленне выканальніцкага майстэрства ў абраным жанры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэс жа навучання ў традыцыйным фальклорным калектыве, разам з імі магчыма разглядаць і мастацка-педагагічную дзейнасць этнааўтэнтычных і ў нейкай ступені этнаграфічных калектываў, ажыццяўляецца непасрэдна падчас выканання тых ці іншых твораў ва ўмовах паўсядзённага жыцця; ён мае ўпарадкаваны, перыядычны характар, які абумоўлены земляробча-гаспадарчым календаром і сямейна-бытавым абрадавым цыклам.

Як мы бачым, і ў тым, і ў іншым выпадку адбываецца рэгламентацыя групавой творчай дзейнасці, толькі зададзена яна рознымі прычынамі. Дзейнасць фальклорна-сцэнічнага калектыву траціць адзін з сутнасных прынцыпаў існавання фальклорнай культуры – унутрысітуацыйнасць. Будучы спецыяльна арганізаванай дзейнасцю такія калектывы трацяць сувязь з бытам, паўсядзённым і святочным. Іх дзейнасць не суадносіцца з прынцыпам прыродаадпаведнасці (кола свят, рытуалаў і дзеянняў, што суправаджаюць іх і паўтараюцца штогод). А ўнутрысітуацыйнасць, як асноватворная рыса фальклорнай культуры, прыродаадпаведнасць, спрыяла не толькі аваладванню мовай фальклору без спецыяльнага выхавання, але і фарміраванню маральных каштоўнасцей, норм паводзін, цвердых пераканаццяў. Са стратай у мастацка-педагагічным працэсе калектываў “сцэнічнага” тыпу ўнутрысітуацыйнасці і прыродаадпаведнасці траціцца і частка належнага ім педагагічнага патэнцыялу фальклору.

2. Навучанне ў аматарскіх фальклорных калектывах “сцэнічнага” тыпу пабудавана на культуры пісьмовай традыцыі ў адпаведнасці з прынцыпамі агульнай і прадметнай дыдактыкі. Мае мэтанакіраваны характар. У выхаваўчым працэсе калектываў, як звычайна, прысутнічаюць суб'ект-аб'ектны (настаўнік-вучні) характар зносін, які зададзены інстытуцыянальнай адукацыяй і падтрымліваецца формай заняткаў.

Вуснасць – адна з прынцыповых умоў існавання фальклору, адна з умоў перадачы фальклорнай інфармацыі. Праз спецыфічныя спосабы навучання, якія належаць фальклорнай традыцыі, адбываецца не толькі ўсведамленне замацаваных традыцыяй норм маралі, звычак, гістарычнага шляху народа, яго каштоўнасцей, не толькі фарміраванне творчых здольнасцей чалавека, якія стымулююць яго на стварэнне новага ў межах традыцыі, але адбываецца і фарміраванне каштоўнаснага свету чалавека, што ўяўляецца нам вельмі значным. Такі спосаб перадачы спадчыны меў ненаўмысны характар. Безумоўна, іншая форма навучання, процілеглая вуснасці, пазбаўляе працэс навучання ў сцэнічных калектывах тых выхаваўчых магчымасцей фальклорнага ўзору, якія рэалізаваліся праз вуснасць.

Педагагічны патэнцыял фальклору пры яго ўзнаўленні ў вучэбнай і выканальніцкай дзейнасці сцэнічных калектываў траціцца ў тым ліку і ад немагчымасці дакладна імітаваць ва ўмовах мастацкага аматарства фальклорнага кірунку такога тыпу міжасобасных зносін падчас сумеснай мастацкай дзейнасці і спосабаў узнаўлення фальклорнага ўзору, якія характэрны для традыцыйных фальклорных гуртоў. Так у сцэнічных калектывах падчас вучэбнай работы назіраецца строга ўсталяваны характар зносін паміж кіраўніком калектыву, які паведамляе інфармацыю, і навучэнцамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія гэтую інфармацыю спажываюць. Такі характар зносін зададзены агульнай адукацыяй, змест якой пераносіцца і ў мастацкае аматарства. Таксама і паміж удзельнікамі калектыву падчас выканальніцтва прасочваецца складанае ўзаемадзеянне, бо сінхроннасць і зладжанасць сцэнічнага дзеяння дасягаюцца толькі дзякуючы спецыяльным рэпетыцыйным заняткам, а рэжысёрскае рашэнне кампазіцыі канцэртных нумароў мае франтальна-лінейны характар. Такі канцэртны нумар вельмі цяжка перанесці ў бытавую сферу і амаль што немагчыма адаптаваць да несцэнічных умоў.

У фальклорнай жа культуры тып зносін у час фальклорнага дзейства мае іншы характар і дазваляе фарміраваць стэрэатып раўнапраўнага ўзаемадзеяння на аснове ўзаемнай павагі і добразычлівасці. Форма кола, якая назіраецца пры такім тыпе зносін, дазваляе выканаўцам і гледачам свабодна мяняць сваю пазіцыю на актыўную ці пасіўную, рабіць гэта з аднолькавым поспехам, у залежнасці ад свайго эмацыянальнага настрою. Беднасць паўнацэнных міжасобасных камунікатыўных кантактаў як у працэсе навучання, так і ў час выканальніцкай дзейнасці ў калектывах "сцэнічнага" тыпу не спрыяе фарміраванню каштоўнаснага свету асобы, яе самасвядомасці.

3. Выкарыстанне рэпертуару ў фальклорных сцэнічных калектывах мае свае заканамернасці. Рэпертуар мае суб'ектыўны характар фарміравання і засваення. Выкарыстоўваецца ён у згодзе з вырашэннем дыдактычных задач у калектыве. Падбіраецца з улікам асаблівасцей успрымання гледачамі канцэртна-сцэнічнага дзейства. Пільная ўвага ў падборы рэпертуару надаецца яго выразнасці, жанравай і стылявой разнастайнасці.

У фальклорнай жа культуры рэпертуар мае аб'ектыўную абумоўленасць фарміравання, засваення і ўзнаўлення фальклорных твораў у згодзе з абрадавымі цыкламі і бытавымі патрэбамі выканаўцаў. Засвойваюцца ўзоры толькі адной лакальнай традыцыі і выконваюцца яны толькі тады, калі павінны гучаць. Калядныя песні ніколі не спяваюцца летам.

Такім чынам, рэпертуарная палітыка ў фальклорных сцэнічных калектывах вядзе да знікнення ўсіх асноватворных механізмаў функцыянавання фальклорнай творчасці: унутрысітуацыйнасці і традыцыйнасці, вуснасці і сінкрэтызму, калектыўнасці; парушае прынцып прыродаадпаведнасці, з-за чаго фальклорныя ўзоры, якія вывучаюцца ўдзельнікамі такіх калектываў, пры іх узнаўленні зноў-такі трацяць пэўную частку свайго педагагічнага ўплыву на асобу, якая належыць менавіта гэтым умовам існавання фальклору.

4. Калі для носьбітаў фальклорнай творчасці і нават для ўдзельнікаў этнааўтэнтычных калектываў фальклор з'яўляецца спосабам жыцця, то адносіны да фальклору ўдзельнікаў фальклорна-сцэнічных калектываў прынцыпова іншыя. Удзельнікі такога калектыву з дапамогай фальклору дэманструюць сябе ў якасці артыста, выканаўцы. Выканальніцтва – гэта эстэтычна спецыялізаваная форма дзейнасці ў фальклорных калектывах сцэнічнага тыпу і накіравана перш за ўсё на стварэнне прадукту выканальніцкага мастацтва. Таму, натуральна, што ўсе намаганні кіраўніка і ўдзельнікаў сканцэнтраваны на падрыхтоўцы канцэртнай праграмы, канцэртных нумароў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выканальніцкая дзейнасць у фальклорнай культуры носіць не спецыялізаваны характар. Прынцыповая несцэнічнасць, бытавая накіраванасць, уплеценасць мастацка-творчай дзейнасці ў паўсядзённае жыццё, у рэальныя абставіны – адна з яе сутнасных характарыстык.

5. І нарэшце, у фальклорнай культуры назіраецца перавага аўтарскіх форм мастацкай дзейнасці, якія носяць варыятыўна-імправізацыйны спосаб узнаўлення фальклорных узораў. Такая дзейнасць часцей сустракаецца ў ансамблевых ці індывідуальных формах выканання. Тады як выканальніцкая дзейнасць фальклорна-сцэнічных калектываў характарызуецца дамінаваннем рэпрадуктыўна-узнаўленча-капіравальнага тыпу мастацкай дзейнасці. Канцэртны нумар у такім калектыве – гэта перш-наперш творчасць хормайстра, балетмайстра, нават рэжысёра, але ніяк не імправізацыя саміх удзельнікаў калектыву. Наяўнасць трох груп у калектыве: вакальнай, харэаграфічнай і інструментальнай, нават пры мінімальнай іх колькасці, абумоўлівае вялікую колькасць удзельнікаў у праграме. Калектыўна-масавы стыль выканальніцтва – адна са спецыфічных рыс фальклорных сцэнічных мастацкіх калектываў.

У выніку, з акадэмізацыяй форм мастацка-творчай дзейнасці застаецца значна менш магчымасцей для цэласнай рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу фальклору, таму што не прымаюцца да ўвагі асноватворныя асаблівасці існавання фальклорнай творчасці і не ствараюцца ўмовы для іх імітацыі. Ступень уплыву выхаваўчага патэнцыялу фальклору на асобу ў межах такога калектыву прама залежыць ад паўнаты рэалізацыі ў яго мастацка-творчым працэсе гэтых асаблівасцей: сінкрэтызму, традыцыйнасці, вуснасці, калектыўнасці і ўнутрасітуацыйнасці. Пісьмовая традыцыя культуры, у межах якой працякае дзейнасць названых калектываў, нараджае сваю мову, выпрацоўвае сістэму яе засваення, што і стварае асаблівасць і непадобнасць навучання. Адсюль вынікае, што калі ў мастацкім аматарстве фальклорнага кірунку спадзявацца толькі на тое, што спажыванне фальклорных твораў ў мастацка-педагагічным працэсе будзе дастаткова для этнакультурнага выхавання яго ўдзельнікаў, то мы памыляемся. Патрабуюцца дадатковыя намаганні, дзе максімальная для дадзенага тыпу калектыву імітацыя характэрных прымет фальклору становіцца адным з сутнасных яго кампанентаў.

---

1. Макушина, Е.Б. Реализация воспитательного потенциала народной педагогики в детских фольклорно-этнографических коллективах : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.05 / Е.Б. Макушина ; С.-Петерб. гос. акад. культуры. – СПб., 1998. – 17 с.

2. Покровский, Д. Фольклор и музыкальное восприятие / Д. Покровский // Восприятие музыки : сб. ст. / Ин-т эстет. воспитания при Цэнтр. Совете Пед. о-ва РСФСР ; ред.-сост. В.Н. Максимов. – М., 1980. – С. 244–256.

3. Ситников, В.И. Теоретико-методологические основы совершенствования подготовки руководителей коллективов фольклорной самодеятельности : дис. … канд. пед. наук : 13.00.05 / В.И. Ситников. – СПб., 1992. – 187 л.

4. Смирнова, Е.И. Художественная самодеятельность как социально-педагогическое явление : дис. … д-ра пед. наук : 13.00.05 / Е.И. Смирнова. – Л., 1989. – 488 л.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ